*Я. А. Кавалеў, аспірант БДУКМ*
*Навуковы кіраўнік – А. А. Гужалоўскі,*
*доктар гістарычных навук, прафесар*

# ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗОНЫ АДЧУЖЭННЯ

Добрыя прыродныя ўмовы паўднёва-ўсходняй часткі рэспублікі, наяўнасць значнай колькасці водных шляхоў спрыялі таму, што дадзеныя тэрыторыі былі заселены раней паўночнай і паўночна-заходніх абласцей Беларусі. Пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца верхнепалеалітычныя паселішчы ў ваколіцах вёсак Юравічы (Калінкавіцкі р-н) і Бердыж (Чачэрскі р-н), а таксама вялікая колькасць стаянак перыяду мезаліту. Іх ахова, вывучэнне і выкарыстанне з'яўляюцца агульнанацыянальнымі праблемамі, якія патрабуюць стварэння сучаснай канцэпцыі выкарыстання помнікаў у адукацыйных і рэкрэацыйных мэтах.

На сённяшні дзень помнікі археалогіі з'яўляюцца адной з найбольш шматлікіх груп сведчання дзейнасці чалавека ў культурнай прасторы чарнобыльскай зоны. Усяго ў пацярпелых раёнах налічваецца ад 370 да 400 старажытных паселішчаў, археалагічных стаянак, гарадзішчаў, курганных могільнікаў [1; 4, с. 25]. Значная частка гэтых помнікаў у перыяд да аварыі на Чарнобыльскай АЭС не была абследавана шляхам правядзення раскопак, што робіць яшчэ больш важнай праблему захавання археалагічнай спадчыны Чарнобыльскай зоны. Акрамя таго, варта адзначыць, што вышэй адзначаная лічба прыведзена на аснове даследаванняў, праведзеных да 1986 г. Рэальная колькасць археалагічных аб'ектаў на тэрыторыі забруджаных раёнаў можа перавышаць гэты паказчык у некалькі разоў. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца дзейнасць Цэнтра археалагічных даследаванняў пры Магілёўскім упраўленні культуры – спецыялізаванай навукова-пошукавай арганізацыі, прыярытэтнымі задачамі якой з'яўляліся выяўленне і ўлік помнікаў археалогіі ў раёнах чарнобыльскай зоны. За перыяд з 1986 па 1998 г. у прасторы забруджаных раёнаў Магілёўскай вобласці было выяўлена 924 археалагічных помніка, у той час як у каталозе «Збор помнікаў гісторыі і культуры БССР» іх налічвалася толькі 170 [2, с. 4]. Між тым існуе шэраг фактараў, якія ствараюць значную пагрозу іх захаванасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін «чарнобыльская зона», які азначае тэрыторыю радыёактыўнага забруджвання, з'яўляецца зборным і ў залежнасці ад узроўню забруджанасці тэрыторыі ўключае ў сябе зоны адчужэння, першачарговага адсялення, наступнага адсялення, зону з правам на адсяленне і зону з перыядычным радыёметрычным кантролем. Віды фактараў дэструктыўнага ўздзеяння змяняюць ўзровень свайго ўздзеяння ў залежнасці ад умоў ўтрымання кожнай з пяці дадзеных тэрыторый.

Найбольш складанай з'яўляецца сітуацыя з захаваннем археалагічных аб'ектаў, размешчаных у межах зон адчужэння і адсялення. Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыёактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на ЧАЭС» [3] у прасторы гэтых зон забаронена пражыванне насельніцтва, а таксама гаспадарчая дзейнасць. На дадзеных тэрыторыях усталяваны кантрольна-прапускны рэжым.

Такім чынам, магчымасць несанкцыянаванага пранікнення «чорных археолагаў» на адселеныя тэрыторыі тут значна менш, чым у зонах наступнага адсялення, з правам на адсяленне і ў зоне з перыядычным радыёметрычным кантролем. Асабліва гэта адносіцца да тэрыторыі Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка (ПГРЭЗ), які быў створаны ў 1988 г. на тэрыторыі 30-кіламетровай зоны адчужэння для недапушчэння пераносу радыяцыйных рэчываў, а таксама аднаўлення прыроднага асяроддзя. У межах запаведніка сканцэнтравана значная колькасць помнікаў мілаградскай, зарубінецкай, кудлаеўскай і іншых археалагічных культур. Напрыклад, толькі ў Хойніцкім сектары ПГРЭЗ існуе шэраг археалагічных аб'ектаў перыяду неаліту і ранняга жалезнага веку (каля былых весак Аравічы, Навакелкі, Ломуш). Дадзеныя землі размешчаны ў памежнай зоне (з Украінай), таму ПГРЭЗ ахоўваецца не толькі супрацоўнікамі запаведніка, інспектарамі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, але і пагранічнымі войскамі, што робіць гэтую частку чарнобыльскай зоны практычна недапушчальнай для несанкцыянаванага пранікнення. Акрамя таго, у першай-другой зонах забаронена любая сельскагаспадарчая і прамысловая дзейнасць. Таму асноўная пагроза археалагічнай спадчыне зоны адчужэння зыходзіць ад зарастання курганоў, стаянак, паселішчаў лесам і іншай расліннасцю, што часта робіць немагчымым іх пошук даследчыкамі. Нажаль, правядзенне раскопак у гэтай, найбольш за-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бруджанай частцы чарнобыльскай зоны можа прывесці да распаўсюджвання радыёактыўных рэчываў і па гэтай прычыне забаронена заканадаўча.

Для сучаснай навукі актуальнымі з’яўляюцца распрацоўка метадаў па захаванню археалагічных каштоўнасцяў, іх дакладнай фіксацыі, а таксама пошук шляхоў інтэрпрэтацыі каштоўнасцяў дадзенай групы і іх трансляцыі ў сучасным грамадстве.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Кірпічэнкава, Н.* З дазіметрам перад іконай / Н. Кірпічэнкава // Культура. – 1993. – № 16.

2. *Копытин, В. Ф.* Свод памятников археологии чернобыльской зоны Могилевской области / В. Ф. Копытин ; под общ. ред. Г. В. Штыхова. – Могилев : Издательство МГУ им. А. А. Кулешова, 1998. – 241 с.

3. О правовом режиме территорий, подвергшихся радиоактивному загрязнению в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС : Закон Респ. Беларусь от 12 ноября 1991 г. № 1227-XI : с изм. и доп. : текст по состоянию на 26 мая 2012 г. [Электронный ресурс] / Департамент по ликвидации последствий аварии на Чернобыльской АЭС. – Минск, 2014. – Режим доступа: http://www.chernobyl.gov.by/index.php?option=com_content&view=article&id=24&Itemid=20.

4. *Тихомирова, Г.* Так как же нам сохранить историко-культурное наследие в чернобыльской зоне? / Г. Тихомирова // Несси. – 1995. – № 13–14. – С. 24–25.



*Н. И. Карачун, магистрант БГУКИ*
*Научный руководитель – В. С. Воропаева,*
*кандидат педагогических наук, доцент*


## ДИАГНОСТИКА УРОВНЕЙ ПОЗНАВАТЕЛЬНОГО ИНТЕРЕСА СТАРШИХ ШКОЛЬНИКОВ К ДОСТОПРИМЕЧАТЕЛЬНОСТЯМ СВОЕЙ СТРАНЫ

Закон «О культуре Республики Беларусь» определяет необходимость не только сохранять и приумножать историко-культурное наследие Республики Беларусь, но и приобщать общество к культуре, истории, формировать духовные ценности и развивать познавательный интерес к наследию своей страны.

При воспитании и обучении подрастающего поколения особое внимание необходимо уделять гражданско-патриотическому

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ